**У Мазыры нас прымалі як родных — і прадстаўнікі выканаўчай улады, і тых устаноў культуры, якія мы пазначылі для наведвання. Апекавалі, але вельмі ненавязліва, размаўлялі, не прыхоўваючы цяжкасцяў, і літаральна “заразілі” (прынамсі, мяне) сваёй любоўю да горада. А Міколу Козенку, які нарадзіўся ў вёсцы Целяпуны, што прылягае непасрэдна да Мазыра, і “заражаць” не патрабавалася: усё тут яму знаёмае, улюбёнае. Менавіта з вядомым этнахарэографам, этнахарэолагам, рэжысёрам, прадзюсарам, выкладчыкам кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, навуковым і мастацкім кіраўніком Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня”, які праходзіць у гарадскім пасёлку Акцябрскі на Гомельшчыне, я і выправіўся ў камандзіроўку.**

Алег КЛІМАЎ, Мінск — Мазыр — Мінск / Фота аўтара


Мазырскі замак.

# Перш чым патрабаваць

## Мазырскія хронікі з Міколам Козенкам

### На кантролі

У краязнаўчы музей Мікола Козенка заўжды хадзіў з задавальненнем ці то з аднакласнікамі, ці то з сябрамі дзяцінства. Улюбёным быў аддзел, прысвечаны ваеннай тэматыцы. Падабалася і разглядаць здымкі старога Мазыра — таго, што назаўжды знік у мінулым. Пазней паўстала цікавасць да прадметаў, якія нясуць этнічны дух: строі, паясы. Сёння ў структуру ўжо Аб’яднанага краязнаўчага музея ўваходзяць, апроч аднайменнай установы, гістарычны цэнтр “Мазырскі замак”, Музей народнай культуры Мазыршчыны “Палеская веда”, Музей-майстэрня Мікалая Пушкара, Выставачная зала і Музей партызанскай славы ў вёсцы Раманаўка.

Малодшы навуковы супрацоўнік Наталля Салавей правяла для нас экскурсію па “Мазырскім замку”, на кампактнай, дагледжанай тэрыторыі якога музей і знаходзіцца. Цяпер тут сталі дзейнічаюць тры экспазіцыі (у залах археалогіі, прыроды і баявой славы воінаў-інтэрнацыяналістаў), праходзяць зменныя выставы.

— Нейкіх глабальных праблем у нашай працы няма, — зазначае Наталля Віктараўна. — Але наведвальнікам хацелася б, каб у музеі быў аддзел аб Мазыры часоў Вялікай Айчыннай вайны. З-за браку плошчаў пакуль не можам адвесці яму месца. Да таго ж, ён патрабуе стварэння навуковай і мастацкай канцэпцыі, у рэшце рэшт, — грошай. І ўсё ж пытанне гэтае, мяркую, у найбліжэйшай будучыні вырашыцца станоўча.

Спадарыня Салавей не аднесла да надзённых праблем тое, што галаўному музею і яго філіялам не зашкодзіла б дадатковае памяшканне, у якім захоўваліся б іх фонды. (Прычым так захоўваліся, як мае быць: каб нідзе не працякала, каб нічога не тлела, а моль не тачыла рэчы.) Справа ў тым, што пытанне трымаюць на кантролі. Сярод бягучых клопатаў супрацоўнікаў — утрыманне комплексу ў належным стане: цэнтр размешчаны на ўзгорку, а, значыць, магчымыя апоўзні. Большая частка аб’ектаў — драўляныя, і пад уздзеяннем надвор’я яны непазбежна пакутуюць.

### Не ў трэндзе справа

З ранняга дзяцінства наш герой адчуваў цягу і да танцаў, і да музыкі. Мама набыла яму баян, які наш герой пачаў асвойваць спярша “для сябе” ў мазырскай школе-інтэрнаце. (Бацька Міколы Козенкі загінуў, калі сыну споўнілася шэсць, і маці, якая выхоўвала пяцёра дзяцей, вымушана была аддаць хлопчыка ў гэтую ўстанову.) Там ён цягам года атрымліваў першыя навыкі харэаграфічнага мастацтва (таксама парада мамы). Дзесяцігадовым Козенка прыйшоў у Палац культуры “Будаўнік”, дзе стаў займацца танцамі ў тамтэйшым ансамблі, а паралельна — баянам у музычнай студыі. У будучыні ён уяўляў сябе ў адной з дзвюх прафесій, але мама мудра палічыла, што захапленні захапленнямі, а жыццёвы шлях трэба выбіраць той, які сапраўды будзе карміць. Ды ўсё ж Мікола не пайшоў у той жа пінскі мяса-малочны тэхнікум, а спыніўся на харэаграфіі...


Супрацоўніцы бібліятэкі Ніна Рагозенка і Ганна Кухарава з Міколам Козенкам.

Пра ПК “Будаўнік” у горадзе кажуць як пра флагман культуры. “Кашу” тут заварваюць народныя калектывы — ансамбль гарманістаў “Мазырскія гармонікі”, ансамбль народнай песні “Мазыранка”, вакальны ансамбль “Розгалас”, вакальны ансамбль эстраднай песні “Медуніца”, а таксама ансамбль “Класічныя гітары”, пяць рок-гуртоў, клубы раманса, спартыўна-бальнага танца, паэзіі... А “ядуць” тую “кашу”, нахвальваючы і просячы дабаўкі, не толькі гараджане. І за межамі Мазыра ведаюць мясцовых творцаў. Яны прадстаўлены на святах агульнадзяржаўных, конкурсах, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях. Адзначаючы ж свой народны ансамбль песні і танца “Паляшучка”, дырэктар Палаца культуры Ірына Федчанка заўважае: у маштабах краіны народнае танцавальнае мастацтва прапагандуецца недастаткова.

— Яго трэба нават у нечым навязваць, тлумачыць, што гэта наша, традыцыйнае, спрадвечнае, вечнае, а па радыё і тэлебачанні з раніцы да вечара рэкламуюць папсу, як быццам вечная — яна, — кажа візаві. — І пад такім націскам цяжка растлумачыць моладзі, дзе сапраўднае, а дзе, скажам так, імгненнае. Азірнуцца не паспеем, як народныя танцы апынуцца занесенымі ва ўмоўную “чырвоную кнігу”...

Развіваючы тэму “моладзь і культура”, Ірына Аляксееўна прызналася, што некаторыя калектывы “Будаўніка” працягваюць трымацца за кошт тых, каму за 30, і прыток свежых сіл не аказаўся б лішнім. (“Граць на акардэоне ў музычных школах раёна амаль не вучаць”, — праінфармавала нас спадарыня Федчанка). А дзе юнакі і дзяўчаты “адрываюцца”, дык гэта на дыскатэках у ПК. (Факт адметны ў святле таго, што сёння цікавасць



Мікола Козенка ўзгадаў былое.



Наталля Салавей.

# ад культуры...

да традыцыйных дыскатэк у краіне не тая, "што раньш было".) Стаўленне да моладзі, якая прыходзіць працаваць у сферу, у дырэктара палаца крытычнае: маўляў, вось так зараз навучальныя ўстановы рыхтуюць спецыялістаў?.. І, разам з тым, кіраўнік як бы апраўдвае "змену": "Перш чым нешта патрабаваць ад культуры, ёй трэба даць цалкам канкрэтнае — фінансы"...

Каментуючы "трэнд "беларускасці", наша суразмоўца сказала, што нацыянальная культура займае асаблівае месца ў працы ПК. Прытрымлівацца моды тут нават няма патрэбы. Слова ж "трэнд" у дачыненні да нацыянальнай культуры спадарыні Федчанка не падабаецца. Але з конкурсамі, на якіх практычна ўсе дзеці спяваюць сусветныя хіты на арыгінальных мовах, а беларускай песні там няма, нешта трэба рабіць.

Новыя лялькі для ўзорнага тэатра лялек "Бураціна" робіць яго ж мастак, ён латае і старыя. Тое зразумела: выраб і рамонт "на баку" каштуюць немалых грошай. І "дамарослага" майстра Ірына Аляксееўна нахвальвае: "Атрымліваецца ў яго нават лепш, чым у тых, хто ў гэтай справе адмыслоўца".

А яшчэ "Будаўнік" перыядычна дае прытулак трупе Мазырскага драматычнага тэатра імя Івана Мележа, якая паказвае ў ПК свае пастаноўкі. Будынак МДТ згарэў у лютым 2013 года, і пакуль няма дакладных дат новых улазін...

## "Танцавальны самвыдат"

У бібліятэкі Мікола Козенка наведваўся ў юнацтве нерэгулярна (акрамя той, што была пад рукой — у школе-інтэрнаце, дзе наш герой бываў, натуральна, часцей). Зімой гуляў у хакей і бегаў на лыжах, летам — футбол, але галоўнае — дапамога маме па гаспадарцы. Падпрацоўваў і ў калгасе. Вясной — пасяўная. Летам ды восенню — уборачная. Але знаходзіўся час і для кніг (не толькі тых, што ўваходзілі ў школьную праграму). У дзяцінстве аддаваў перавагу, скажам, "Міколку-паравозу" Міхася Лынькова, часопісам "Мурзілка", "Бярозка". Сталеючы, Мікола перайшоў да твораў, якія фармавалі яго ўжо як асобу: "Дудка беларуская" Францішка Багушэвіча, "Скрыпка беларуская" Цёткі. Зараз чытае "Мяжу" Андрэя Федарэнкі. Прафесійнай жа харэаграфічнай літаратуры ў бібліятэках наогул было мала, па беларускай харэаграфіі — яшчэ менш. Складана і працаёмка гэта — пісаць пра танцы і прафесійна, і жывой мовай.

...Прасторныя, зіхоткія чысцінёй памяшканні Цэнтральнай бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна. (Асабліва мяне ўразіў пакой, дзе насельніцтву аказваюць платныя паслугі (сканар, капіравальны апарат, дзе ўсё з выгляду новае, сучаснае) і сектар інфармацыі, які прапануе спецыяльныя бібліятэчныя паслугі.) І супрацоўнікі — адухоўленыя, добразычлівыя і, вядома, закаханыя ў сваю працу. Намеснік дырэктара Мазырскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Ганна Кухарава даводзіць да нас "чарт" найбольш запатрабаваных айчынных пісьменнікаў: Батракова, Лісіцкая, класікі (тых, што чытаюць школьнікі і студэнты). Беларускамоўныя кнігі попытам карыстаюцца — такім жа, як і па ўсёй краіне. Далучаюць да іх наведвальнікаў, праводзячы дэкады беларускай і краязнаўчай літаратуры. Нейкі час пасля іх заканчэння аддача ад мерапрыемстваў адчуваецца, а на 2016 год да іх дадасца яшчэ адзін праект па папулярызацыі такіх твораў. Да таго, што бібліятэкі сёння становяцца збольшага інфармацыйна-забаўляльнымі ўстановамі, у ЦБ ставяцца з разуменнем і практыкуюць унутраныя "святочныя" і выязныя мерапрыемствы, накіраваныя на прыцягненне чытацкай аўдыторыі.

А хвалюе "пушкінцаў" пытанне камплектавання: не ў тым аб'ёме, у якім хацелася б, набываецца для іх самая розная літаратура, не ўсякае дарагое і "хітовае" выданне могуць яны сабе дазволіць — фінансы спяваюць рамансы і ў гэтым аспекце. Аптымізацыя, натуральна, кранула і ЦБ: так, функцыі гардэробшчыка выконвае тэхнічны служачы...

Кнігі па харэаграфіі, дарэчы, у бібліятэцы мы знайшлі. Сітуацыя з імі... скажам так, не змянілася: і сёння адпаведныя падручнікі і папулярныя выданні рэдка сустрэнеш што ў бібліятэках, што ў крамах.

— Мы — тыя, хто выкладае, ставіць танцы, — як правіла, малюем і апісваем іх самі — рухі, паставы і гэтак далей. Вось і вучым па такім "самвыдаце", — канстатуе Мікола Аляксеевіч. — Ці па тым, што было напісана па гэтай тэме ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Наклад жа сучасных і адносна сучасных выданняў, метадычак, у якіх хоць неяк прадстаўлены беларускія танцы, вельмі невялікі. Добра, што ў нас ёсць Інстытут культуры Беларусі, які нешта робіць у гэтым кірунку.

"Нармальны боршч", — як сказаў бы мой знаёмы кулінар. XXI стагоддзе на дварэ — з усімі наступствамі. А сакрэты нацыянальнага танцавальнага мастацтва перадаюцца з пакалення ў пакаленне ў тым ліку і ранейшым шляхам — архаічным, вусным: як адна бабуля распавяла, як адзін дзядуля казаў, пасля ўсё гэта намалюецца... А можа, сапраўды такая папяровая літаратура сёння не патрэбная, калі ёсць Інтэрнэт, у якім дэманстратары раскладуць любы танец на пэўныя па? Урэшце, трэба і тое, і іншае, пераканаены Мікола Аляксеевіч, але відэаматэрыялаў па беларускай харэаграфіі таксама амаль няма...

## ...І некалькі абзацаў пра "Берагіню"

Козенка са шкадаваннем заўважыў, што за ўсе гады існавання фестывалю "Берагіня" не так шмат, як хацелася б, мазырскіх выканаўцаў і калектываў удзельнічала ў яго мерапрыемствах меназіта ў Акцябрскім (у асноўным іх можна было ўбачыць у рамках форуму на іншых пляцоўках). Чаму? Па словах этнахарэографа, паводле афіцыйных дакументаў, нельга павялічыць агульную колькасць удзельнікаў фэсту, а кожная вобласць можа быць прадстаўлена на ім пэўным лікам.

Аксіёмай з'яўляецца тое, што народная культура мае патрэбу ў падтрымцы на дзяржаўным узроўні. Але такой, якой яна ёсць сёння, лічыць Мікола Аляксеевіч, недастаткова. Так, на яго думку, неабходна асобная ўстанова, гэткі асобны цэнтр беларускай культуры, які б на практыцы каардынаваў па ўсёй краіне працэсы, якія адбываюцца ў аматарскай творчасці, звязаныя з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Такая структура была, кажа Козенка, — Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, але некалькі гадоў таму яго расфарміравалі. Разам з гэтым аказаліся парушанымі многія сувязі паміж тымі, хто займаўся традыцыйнай культурай на месцах, прыпыненыя ці спыненыя наогул некаторыя цікавыя праекты. Як адбіваецца тое на народнай культуры? Таму ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў як могуць выкручваюцца, каб паставіць канкрэтны народны танец у першаснасці. Адна з прычын — не стае студэнтаў: не прагне моладзь прысвяціць сваё жыццё такому мастацтву. А потым па тэлевізары пад выглядам аўтэнтыкі нам паказваюць "шоу" з фольк-адценнем. "А як фінансуецца народная культура?" — задае пытанне Козенка і сам жа на яго адказвае:

— Асноўнае фінансаванне двух апошніх форумаў "Берагіня" лягло на плечы вобласці і раёна, а фестываль мае статус рэспубліканскага... І як ужо мясцовыя ўлады выходзілі са становішча?.. Я, як яго аўтар і кіраўнік, за свой кошт абзвоньваў удзельнікаў "Берагіні". Гэта нармальна?..

Але ў песімізм Мікола Аляксеевіч не ўпадае. У планах правядзенне ў рамках мерапрыемства ў розных рэгіёнах навукова-практычнай канферэнцыі "Традыцыйная культура і дзеці" (гэты праект ужо быў апрабаваны), акцыі "Народная проза", конкурсу танцавальных пар, фестывалю аўтэнтычнага мастацтва... Праўда, некаторым гэтым планам... каторы год...

К

Клімаў, А. Перш чым патрабаваць ад культуры... / Алег Клімаў // Культура. - 2016. - №2 (9 студзеня). - С. 10-11.